# Падарожжа-віктарына «Зямля бацькоў – мая зямля»

Пазакласснае мерапрыемства для вучняў 8 классаў

**Т. К. Грэбень,**
настаўніца беларускай мовы і
літаратуры вышэйшай катэгорыі
гімназіі імя У. І. Нядзведскага
г. Мікашэвічы Брэсцкай вобласці

**Засваенне вучнямі агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцяў, культурных і духоўных традыцый беларускага народа з'яўляецца падмуркам для выхавання ў іх грамадзянскасці і патрыятызму. Выкарыстанне краязнаўчых матэрыялаў не толькі пашырае веды вучняў пра мінулае і сучаснасць роднага краю, але і спрыяе выхаванню пачуцця гонару і павагі да нацыянальнай і культурнай спадчыны. Пазакласнае мерапрыемства «Зямля бацькоў – мая зямля» пашырае кругагляд падлеткаў, паглыбляе веды пра традыцыі, звычаі, культуру і гісторыю Беларусі.**

**Мэты**: пашырыць веды вучняў пра мінулае і сучаснае роднага краю, яго гістарычную і культурную спадчыну; стварыць умовы для развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў, фарміравання іх камунікатыўных уменняў, культуры маўлення; абуджаць цікавасць да гісторыі і культурнай спадчыны роднага краю, выхоўваць грамадзянскасць, патрыятычныя пачуцці гонару за Радзіму, яе мінулае, свой народ.

**Абсталяванне**: мультымедыйная устаноўка, запісы песень, прэзентацыя

**Форма правядзення**: урок-падарожжа

О Беларусь, мая калыска,
Жыццё маё, прытулак мой!
З гарачаю любоўю нізка
Схіляюся перад табой.
*Пімен Панчанка*

**Ход мерапрыемства**

*Гучыць песня «Спадчына» (сл. Янкі купалы, муз. І. Лучанка).*

**Настаўнік.** Родны край, Радзіма, Бацькаўшчына, зямля бацькоў… яшчэ зусім маленькімі мы ўпершыню чуем гэтыя словы. А ці задумваліся вы, што яны значаць асабіста для вас? Кожны чалавек укладвае ў ніх нешта сваё. Для аднаго гэта ўся неабсяжная краіна ад мяжы да мяжы, для другога – гэта вёска, дзе жылі бацькі яго бацькоў, для трэцяга – гэта месца, дзе чалавек упершыню захапіўся дзівоснай прыгажосцю прыроды: адчуў водар кветак, пачуў спеў жаваранка, убачыў зіхатлівы ўсход сонца…

Родны край –гэта і сонца над галавой, і паветра, якім ты дыхаеш, гэта старажытныя лясы, блакітныя азёры і бяскрайнія прасторы палёў… Гэта і вялікія прыгожыя гарады, і зусім малыя вёскі, дзе ўсе жыхары добра адзін аднаго ведаюць. Гэта мова, якую даў табе народ, і песня, што засталася ад прадзедаў, і гераічная слава бацькоў…

Калі спытаць, ці любіце вы свой родны край, то, безумоўна, вы адкажаце: «Так!» Яшчэ **Уладзіслаў Сыракомля** пісаў: «Нельга палюбіць родную маці-зямлю без глыбокага і шырокага пазнання ўсяго яе аблічча …»

Сёння нашу пазакласную сустрэчу мы правядзём у форме падарожжа віктарыны “Зямля бацькоў – мая зямля”. Дзве каманды 8-га класа: “Сябры” і “Беларусы”. Падчас нашага падарожжа камандам давядзецца адказваць на пытанні, кожны правільны адказ каштуе 1 бал.

**Прыпынак 1 «Беларусь у свеце».**

**Вядучы 1.** На карце вялікага свету
Яна – як зялёны лісток,
Песня гарачага лета,
Крынічнай вады глыток.

Адвечная калыханка,

Душы запаветны куток. *Васіль Вітка.*

Рэспубліка Беларусь знаходзіцца ў цэнтральнай частцы Еўропы. Яна займае тэрыторыю плошчай 207,6 тыс. км2, што складае прыкладна 2% ад плошчы Еўропы. Працягласць з поўдня на поўнач – 560 км, з захаду на ўсход – 650 км. Беларусь не такая вялікая краіна, як Расія альбо Амерыка, але ж і не маленькая. Пехатою ад Оршы да Брэста чалавек ішоў бы два тыдні і стаптаў бы дзе пары чаравікаў.

Наша дзяржава сухапутная, бо не мае выхаду да мора. Бліжэйшым да яе з'яўляецца Балтыйскае мора. З Беларуссю мяжуюць нашы суседзі – Расія, Украіна, Польшча, Літва, Латвія.

**Вядучы 2**. Сталіца нашай краіны – город Мінск.

Дзяржаўнае ўладкаванне – прэзідэнцкая рэспубліка.

Нацыянальная валюта – беларускі руб**е**'ль.

Дзяржаўныя мовы – беларуская і руская.

Колькасць насельніцтва – 9,5 мільёнаў чалавек. Большасць насельніцтва Беларусі жыве ў гарадах. Колькасць гарадскога насельніцтва складае 77 % ад агульнай колькасці насельніцтва краіны. У Мінску, самым вялікім горадзе Беларусі жыве амаль 2 мільёны чалавек. Ёсць у нас невялікія гарады, а ёсць і зусім малыя вёскі, дзе ўсе жыхары добра адзін аднаго ведаюць.

У Беларусі пражываюць прадстаўнікі звыш 140 нацыянальнасцей, сярод якіх найбольш шматлікімі з'яўляюцца беларусы (81 % ад агульнай колькасці насельніцтва), побач з імі жывуць і працуюць рускія, палякі, украінцы, татары, яўрэі, цыгане, літоўцы, малдаване і іншыя.

**Конкурс «А ці ведаеце вы? », частка 1.**

1. Колькі беларусаў пражывае ў свеце?(К*аля 14 мільёнаў.*)
2. Якое дзяржаўнае свята адзначаецца 15 сакавіка? (*Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.*)
3. Калі святкуецца Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь? (*3 ліпеня.*)
4. 3 ліпеня 2013 года у Мінску была адкрыта плошча. Па яе

перыметры размешчаны тэкст дзяржаўнага гімна, гербы абласцей і нашай сталіцы. Якую назву мае гэтае месца ў Мінску? *(Плошча Дзяржаўнага Сцяга.)*

5. Гімн расказвае пра мінулае беларускага народа, у ім гучыць пажаданне славы, росквіту, вечнага жыцця Беларусі, заклік любіць і шанаваць Радзіму. Хто з’яўляецца аўтарамі музыкі і тэксту Дзяржаўнага гімна? *(Музыка Нестара Сакалоўскага, словы Міхася Клімковіча і Уладзіміра Карызны.)*

6. Герб і сцяг Рэспублікі Беларусь прыняты ў выніку ўсенароднага галасавання 14 мая. У якім годзе яно адбылося? *(У 1995.)*

7. Якое найважнейшае права чалавека замацавана ў Канстытуцыі. *(Права на жыццё.)*

8. Якой літары беларускага алфавіта пастаўлены помнік? І ў якім горадзе Беларусі? ( Літары *Ў, у Полацку.*)

**Настаўнік.** Беларусь – старажытная краіна. Яна мае сваю багатую гісторыю, людзі прыйшлі сюды яшчэ сорак тысяч гадоў назад.У мінулым – духоўныя традыцыі і карані нашага народа.

**Прыпынак 2 «Спадчына роднай краіны».**

**Вядучы 1**. Самае старадаўняе княства, аб якім мы ведаем з летапісаў, – Полацкае. Полацк – самы старажытны горад Беларусі. Летапісцы паведамляюць, што ён існаваў ужо ў 862 годзе. Першыя вядомыя нам прозвішчы князёў – Рагвалод і яго дачка Рагнеда. А потым было на нашай зямлі шмат розных падзей. Ствараліся і развальваліся вялікія дзяржавы, прыходзілі са зброяй чужынцы і з ганьбай адыходзілі.

**Конкурс «А ці ведаеце вы? »,частка 2.**

1. Вялікае Княства Літоўскае – дзяржава ад мора да мора. Ад якога мора да якога? *(Ад Балтыйскага да Чорнага.)*
2. У якім горадзе знаходзілася першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага? *(У Навгрудку.)*

3.У якім горадзе знаходзіцца самы знакаміты замак Беларусі? *( У Міры.)*

4.Каму належаў Нясвіжскі замак? *(Князям Радзівілам.)*

5.Каго, паводле падання, запрашалі ў Нясвіж для стварэння карціннай галерэі? *(Рэмбранта.)*

6.Які горад называюць брамай краіны? Чым яшчэ вядомы гэты горад? *(Брамай краіны называюць горад **Брэст**. Гэты горад Уладзімір Караткевіч называў «месцам майстроў». У **1553** годзе тут была заснавана першая на тэрыторыі Беларусі друкарня.)*

7.Які горад называюць сэрцам беларускага Палесся? *(Тураў.)*

8.Які вядомы беларускі пісьменнік нарадзіўся ў Оршы? *(Уладзімір Караткевіч.)*

9.Як называлася аперацыя па вызваленні Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны? *(«Баграціён».)*

10. На якія святы спявалі наступныя песні?

- ✓ А ў гэтым даму сам пан гаспадар,
  Шчодры вечар добрым людзям!
  Сам пан гаспадар дай на покуце,
  Шчодры вечар добрым людзям!
  Шчодры вечар! *(Каляды.)*
- ✓ Дапамажы, Божа, вясну заклікаці
  На ціхае лета, на ядрано жыта,
  Жыта і пшаніцу... *(Гуканне вясны.)*
- ✓ Ой, на Йвана сонца йграла!
  Сонца йграла!
  Сонца йграла
  І з месячыкам размаўляла... *(Купалле.)*

11. На якое свята катэгарычна забаранялася біцца? За бойку страшылі градабоем на ўсю вёску. *(Вялікдзень.)*

12. Было пашырана павер'е, што да гэтага свята нельга есці яблыкі, бо дзеці будуць хварэць і паміраць. Якое гэта свята? *(Яблычны спас.)*

13. Гэта дзень ушанавання ўсіх памерлых. У які дзень кожны павінен быў успомніць лепшыя рысы прашчураў, аддаць ім належную павагу. (*Дзяды)*

**Прыпынак 3 «Архітэктура Беларусі ».**

**Вядучы 1.** Нягледзячы на складаную гісторыю, поўную войнаў і разбурэнняў, многія архітэктурныя каштоўнасці Беларусі захаваліся. Найбольш старадаўнія збудаванні ў Беларусі адносяць да Сярэдневякоўя. Розныя напрамкі ў мастацтве і рэлігіі паўплывалі на фарміраванне архітэктуры Беларусі. У нашай краіне можна знайсці ўзоры раманскага стылю і готыкі, барока і класіцызму, мадэрна і эклектыкі.

**Конкурс «Помнікі архітэктуры Беларусі ».**

Удзельнікам неабходна правільна вызначыць па здымках месцазнаходжанне архітэктурных помнікаў Беларусі і назваць іх.( *Мірскі, Лідскі і Нясвіжскі замкі, Камянецкая (Белая) вежа, Спаса-Ефрасіннеўская царква, Барысаглебская (Каложская ) царква ў Гродна, Свята-Міхайлаўская царква ў Сынкавічах (Зэльвенскі раён), Касцёл святых Сымона і Алены (Чырвоны касцёл), Святауспенскі Жыровіцкі манастыр.*)

**Прыпынак 4 «Беларускія краявіды ».**

**Вядучы 2.** Беларускія краявіды…

Перазвоны азёр і бароў.

Над палеткамі бульбы і жыта –

Песня велічных курганоў. *Анатоль Грачанікаў*

Здзіўляюць сваёй першароднай прыгажосцю Белавежжа і Бярэзіна, Нёманскі край і Палессе. Плывуць рэкі вялікія і малыя, ззяюць блакітам азёры. Тут захаваўся зубр-волат. На Радзіму з далёкага выраю вяртаюцца вясной буслы. Не вабяць іх заморскія дзівосы, спяшаюцца нашы разумныя белакрылыя птахі ў родныя мясціны.

**Вядучы 1.**Тут Дняпро бяжыць прывольна,

Сож, Бярэзіна, Дзвіна,

Прыпяць, Шчара, Свіслач, Нёман,

Вілля, Піна, Буг, Дзісна.

Тут крыштальныя азёры –

Нарач, Свіцязь, Снуды, Свір… *Міхась Пазнякоў.*

Нездарма нашу краіну называюць сінявокай. Беларусь – гэта больш за 10тысяч азёр і каля 21 тысячы рэк і ручаёў.

Усе рэкі і азёры Беларусі вельмі прыгожыя. Дняпро з высокім правым берагам, неаглядньмі далячынямі зарэчных паплавоў. Прыпяць з яе празрыстай цёмнай вадой, астравамі, пратокамі і шапкамі буслянак на прырэчных дрэвах. Ласкавы Нёман, у воды якога глядзяцца старажытныя вежы. А яшчэ ў розных рэгіёнах цякуць Дзвіна, Сож, Пціч, Шчара, Бесядзь, Ясельда …

**Конкурс «А ці ведаеце вы? »,частка 3.**

1. Якое самае вялікае возера ў Беларусі? (*Возера Нарач на Мядзельшчыне. Яго даўжыня – 12,8 км, а шырыня - 10, 8 км, даўжыня берагавой лініі – 40 км.*)
2. У якім возеры раскінуўся самы буйны востраў? (*У другім па велічыні возеры Беларусі – Асвейскім. Плошча вострава – 5 км2.)*
3. Якое возера з’яўляецца трэцім па велічыні ў нашай краіне*? (Чырвонае возера. У даўніну яго называлі Князь-возера.)*
4. Якое возера ў Беларусі самае глыбокае? *(Самае глыбокае возера ў Беларусі – возера Доўгае, што ў Глыбоцкім раёне. Яго глыбіня дасягае 53, 7 м.)*
5. Якая рака ў Беларусі самая вялікая (доўгая)? *(Самая вялікая рака ў Беларусі – Дняпро. Яе басейн займае больш паловы тэрыторыі Беларусі.)*
6. Якая рака з’яўляецца трэцяй па велічыні ў Еўропе пасля Волгі і Дуная*? (Дняпро. У старажытных летапісах яна мела гонар звацца шляхам « з вараг ў грэкі ».)*
7. Якая рак перасякае мяжу Беларусі тры разы? *(Рака Бесядзь, прыток ракі Сож.)*
8. Якія рэкі цякуць праз Лунінецкі раён? *(Праз Лунінецкі раён цякуць рэкі Бобрык, Смердзь, Лань, Люта, Цна, Случ)*

**Прыпынак 5 « Славутыя імёны Беларусі ».**

**Вядучы 2.** Наш родны край – гэта людзі: і тыя, з якімі ты ступіў у жыццё, якія заўсёды гатовы прыйсці табе на дапамогу, і тыя, імёны якіх дайшлі да нас праз стагоддзі, якія жылі, змагаліся і марылі пра тое, каб наша Радзіма займала пачэснае месца сярод іншых краін свету.

Беларусь можа ганарыцца імёнамі выдатных дзеячаў, якія нарадзіліся на гэтай зямлі. Гэта вынаходнік шматступеньчатай ракеты Казімір Семяновіч, адкрывальнік бяздротавай перадачы электрычных сігналаў Якуб Наркевіч-Ёдка, народны герой Чылі Ігнат Дамейка і іншыя славутыя землякі. Са старадаўніх беларускіх родаў паходзяць матэматык Соф’я Кавалеўская, падарожнік Мікалай Пржэвальскі, кампазітар Дзмітрый Шастаковіч, авіяканструктар Павел Сухі .

**Конкурс «А ці ведаеце вы? »,частка 4.**

1. Была яна дапамогай пакрыўджаным,

Суцяшэннем смуткуючым,

Распранутым – адзеннем, хворым – наведаннем

Ці, проста кажучы, – для ўсіх была ўсім. Хто яна? (*Ефрасіння Полацкая.)*

*2.* Назавіце славутую беларускую князёўну, дачку Рагвалода, якая мела тры імені. Якія гэта імёны? *(Рагнеда – Гарыслава – Анастасія.)*

3. У яго княжанне дзяржава дасягнула найбольшай магутнасці. «Не чалавек, а ваўкалак», – казалі пра яго. Сапраўдным помнікам яму можна назваць пабудаваны ў Полацку Сафійскі сабор. *(Усяслаў Чарадзей.)*

*4.* У 14-гадовым узросце ён паступіў у адзін са славянскіх універсітэтаў, па заканчэнні якога атрымаў ступень доктара філасофіі .Яшчэ праз колькі год жыццёвы шлях прывёў яго ў Італію. Сцвердзіўся ў прафесіі, на якую не вучыўся, 6 жніўня 1517 года. У канцы жыцця працаваў каралеўскім садоўнікам у Чэхіі. *(Францыск Скарына 6 жніўня 1517 выдаў «Плалтыр» у Празе.)*

*5.* Дыпламат, дзяржаўны і грамадскі дзеяч Вялікага Княства Літоўскага. Вечным помнікам яму з'яўляецца падрыхтаваны і выдадзены на беларускай мове адзін з найбольш дасканалых узораў сусветнай юрыдычнай думкі таго часу – Статут ВКЛ 1588 года. *(Леў Сапега.)*

6. Назавіце сапраўднае імя і прозвішча Янкі Купалы. *(Іван Дамінікавіч Луцэвіч.)*

7. Якім псеўданімам падпісваў свае творы Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч? *(Якуб Колас.)*

*8.* Першы беларускі касманаўт, вучоны, двойчы Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся ў вёсцы Камароўка Брэсцкага раёна ў 1942 годзе. Ажыццявіў тры палёты ў складзе экіпажаў касмічных караблёў і арбітальных комплексаў. *(Пётр Клімук.)*

*9.* Авіяканструктар, стваральнік больш як 50 самалётаў, нараўдзіўся ў горадзе Глыбокае Віцебскай вобласці, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы. *(Павел Сухі.)*

10. Легендарная гімнастка заваявала 4 залатыя алімпійскія медалі, тры з іх – на Алімпійскіх гульнях у Мюнхене ў 1972 годзе. У тым жа годзе прызнана лепшай спартсменкай свету. *(Вольга Корбут.)*

*11.* Беларуская тэнісістка, пераможца Адкрытага чэмпіянату Аўстраліі (2012, 2013 гадоў) у адзіночным разрадзе; з 30 студзеня 2012 і з 9 ліпеня 2012 двойчы першая ракетка свету. *(Вікторыя Азаранка.)*

*12.* Трохразовая чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў 2014 году, двухразовая чэмпіёнка свету, Герой Беларусі. Пераможца Кубка свету ў сезоне 2014 – 2015 гадоў.*(Дар'я Домрачава.)*

**Настаўнік** . Праведзеная сёння віктарына дала нам магчымасць яшчэ раз пераканацца, што мы жывём у цудоўнай і непаўторнай, багатай на гістарычныя падзеі краіне. Уладзімір Караткевіч пісаў: «Калі вы станеце дарослымі – яны будуць яшчэ прыгажэйшымі, нашы вёскі і гарады. Вы пройдзеце па іх вуліцах, і вам самім захочацца прыкласці свае рукі, свае веды і ўмельства для таго, каб зрабіць іх дзівам дасканаласці, а зямлю нашу –

найлепшай у свеце зямлёй. … Любіце гэтую сваю святую зямлю аддана і да канца. Іначай вам не дадзена, дый не патрэбна».

**Вядучы 1.** Паклон табе, мой беларускі краю!

Ты – мой, я – твой: ад роду і навек.

Я зноў і зноў да сэрца прыкладаю

Твой ліст дубовы – як чароўны лек.

За хлеб, што ем, за песні, што спяваю,

За шчасце звацца іменем тваім –

Паклон, паклон табе, мой родны краю!

Ты – мой, я – твой: усюды і ва ўсім! *Н. Гілевіч.*